Не гэтага свята стала падзеей у культурным жыцці беларусаў, аказала значную падтрымку развіццю народных промыслаў. Практыка паказала, што святы народных рамёстваў аказаліся настолькі прыцягальнымі, што іх сталі ладзіць па ўсей Беларусі не толькі як самастойныя святы: цяпер яны амаль што ва ўсіх гарадскіх паселішчах сталі адной з абавязковых састаўных частак свята горада.

Поспех і папулярнасць адроджанага кірмаша, а таксама яго унікальныя магчымасць адначасова задаволіць многія запатрабаванні чалавека аказаі значны ўплыў на развіцце сучаснай святочнай культуры гарадоў Беларусі, дзе пачынаючы з 90-х гадоў ніводная значная ўрачыстасць не абыходзілася без святочнага гандлю з відовішчамі і забавамі. Напрыклад, адметнай асаблівасцю свята г.Мінска з'яўляецца грандыёзны кірмаш, які ўяўляе сабой шэраг спецыялізаваных таргоў са спецыфічнымі комплексамі забаў (ярмарка народных рамёстваў, кветкавы рынак, птушыны базар, ярмаркі бытавых паслуг, прамысловых і сельскагаспадарчых тавараў, выстаўкі-продажы вырабаў мастакоў і канструктараў, вырабаў навучэнцаў ПТВ, дзіцячая ярмарка). Асаблівасцю штогодніх гандляў на свяце г.Гродна стала арганізацыя спецыялізаваных таргоў для розных этнічных груп насельніцтва. Ужо некалькі год тут арганізоўваюць беларускі кірмаш, польскі рынак і літоўскую ярмарку як асобныя гандлева-гульнявыя зоны, куды прывозяць тавары з Літвы, Польшчы, Беларусі і выступаюць нацыянальныя творчыя і спартыўныя калектывы.

Такім чынам, новая прававая беларускай святочнай культуры - кірмаш, адрадзіўшыся ў разнастайных формах творчага ўвасаблення, стаў многафункцыянальным святам, якое дае магчымасць чалавеку рэалізаваць розныя матэрыяльныя і духоўныя запатрабаванні.

## СВЯТА, ЯК САЦЫЯЛЬНАЯ УМОВА ФАРМІРАВАННЯ ТВОРЧЫХ ЗДОЛЬНАСЦЕЙ ДЗЯЦЕЙ

І.М.Гаранец (аспірантка)

Традыцыі звязваюць час, без іх жыццё губляе свой сэнс, таму што страчвае паслядоўнасць, пераемнасць. Традыцыі гэта не проста звычаі, яны маюць нарматыўны характар. Традыцыі надаюць



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзеяннам чалавека дадатковую моц, неабходнасць захавання звычаяў у адносінах да нашчадкаў. Нашчадкі не могуць добра ведаць папярэдняе жыццё грамадства, таму неабходна расказаць кожнаму дзіцяці адну і тую ж гісторыю адначасова. Толькі падобнае тлумачэнне гісторыі і можа стаць аховай абаронкай для чалавека. Таму неабходна абараняць і захоўваць традыцыю як носьбіта чалавечых і грамадскіх каштоўнасцей.

Адной з такіх устойлівых каштоўнасцей з'яўляецца традыцыйнае народнае свята. Свята захоўвае і канцэнтруе ў сабе станоўчы опыт соцыума, увасабляе утапічныя яго мары. Яно адцягвае чалавека ад штодзённасці і далучае яго да радаснага, незвычайнага сусвету, які жыве па асобным творчым законам.

У элементах святочнага дзеяння: рытуале, абрадзе, гульне, усялякіх формах мастацкай творчасці як у люстэрку адлюстроўваюцца ўяўленні людзей аб добрым і дрэнным. Менавіта таму традыцыйнае свята заўсёды з'яўлялася не толькі магчымасцю ўвядзення дзіцяці ў соцыум, далучала да сацыяльных каштоўнасцей, але і выхоўвала яго ў грамадстве, фарміравала пазітыўныя адносіны да гэтых каштоўнасцей.

Але гэта толькі той напрамак, які выхоўвае асобу. Другая асаблівасць свята - гэта развіццё дзіцяці, фарміраванне яго здольнасцей. Падкрэсліваючы тое, што свята, безумоўна, развівае усе здольнасці дзіцяці, мы, тым не менш, канцэнтруем свой погляд на творчых здольнасцях дзіцяці - удзельніка свята.

Творчасць - гэта дзейнасць, якая ажыццяўляецца ва ўмовах невызначанасці, неакрэсленасці, а творчыя здольнасці забяспечваюць прадуктыўную дзейнасць у гэтых умовах. Традыцыйнае свята заўсёды з'яўляецца асяроддзем невызначанасці для дзіцяці, таму што яно не мае сацыяльна-жыццёвага вопыту. Такім чынам, элементы святочнага дзеяння становяцца сродкамі, якія актуалізуюць творчыя здольнасці, робяць іх канкрэтнымі і ўвасобленымі.

Кожнае нацыянальнае свята - ўзор унікальнасці засваення свету народам. Гэтая непаўторнасць складваецца з розных рэчаў: ежы, адзення, абставіны і г.д., якія патрабуюць мастацка-творчых намаганняў людзей.

Дзеці, якія ўдзельнічаюць у працэсе падрыхтоўкі свята дыферэнцыруюцца адпаведна сваім задаткам, якія паступова фармі-

рующца у здольнасці. У сувязі з тым, што традыцыйная мастацка-творчая дзейнасць унікальна па сваей грунтоўнасці, можна выказаць думку, што дзіця фарміруе унікальныя творчыя здольнасці.

Паколькі унікальнасць - аспект безумоўна творчы, а засваенне сусвету дзіцем - аспект сацыяльны, таму дзіця, якое далучаецца у свяце да сацыяльных каштоўнасцей, фарміруе свой творчы патэнцыял на базе унікальнасці, непаўторнасці сваей нацыянальнай культуры.

## КУПАЛЬСКАЕ СВЯТА І ЯГО РОЛЯ У ДУХОЎНЫМ АДРАДЖЭННІ БЕЛАРУСАЎ

Н.А.Міцкевіч

Купалле адзначалася з 23 па 24 чэрвеня і з'яўлялася самым насычаным абрадамі старажытным святам. Купалле складалася як урачыстасць у гонар летняга сонцастаяння. Гэта было свята найвышэйшага росквіту усіх зямных сіл. Галоўнае у купальскіх абрадах - гэта культавая аснова, якая мела аграрную скіраванасць.

Адным з выходных момантаў абрадавага рытуалу з'яўляецца культавае паважанне раслін, а таксама дзвюх стыхій - агню, вады. Старажытныя продкі славян лічылі, што агонь гэта энергія сонца, таму пакланяліся яму, лічачы яго ахоўнікам жыцця на Зямлі. Пакланенне сонцу - найболей вядомая форма праяўлення купальскага культу. Безумоўна ахоўна-ачышчальны абрадавы сэнс мелі купальскія звычаі спальваць адзенне хворых дзяцей, скакаць праз па-аючае вогнішча, кідаць галавешкі у жыта, адпалохваючы пры гэтым злых духаў, ведзьмаў. Абрад спальвання жывога купальскага дрэва ўяўляе сабой некаторае падабенства са звычаямі пахавання. Тут прыкметны рысы карнавалізацыі, дзе культавая аснова зноў з'яўляецца у форме маскі. У гэтым стане купальскае свята падобна да карнавалу. У паўднева-заходніх раенах Беларусі лічылась даўней традыцыяй спальванне лялькі-Купалы: яна ж ведзьмарка, чараўніца, русалка. Існуе таксама устойлівая традыцыя у купальскую ноч прыбіраць рушнікамі і кветкамі "аброчныя крыжы". Характэрны ля купальскай карнавалізацыі маскі старога гарбатага дзеда, маскі дзеда і бабы, якія сваім абліччам нагадваюць